**ГУРЛО́** Ніна Мікалаеўна (н. 12.4. 1946, Мінск), беларускі мастак. Дачка М.В.*Гурло*. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1969). Працуе ў галіне сцэнаграфіі і станковай графікі. Створаныя Г. касцюмы вылучаюцца разнастайнасцю, трапнасцю вобразных характарыстык, пранікненнем у стылёвыя асаблівасці эпохі, графічныя творы — тонкай пластычнасцю, гармоніяй ліній і лірызмам. Сярод асн. работ: касцюмы да к/фільмаў «Прададзены смех» (1981), «Белыя Росы» (1983), «Восеньскія сны» (1987), «Шляхціц Завальня» (1994), «Сын за бацьку» (1995), «Масакра» (2010); да спектакляў: «У змроку» А.Дударава (1996), «Раскіданае гняздо» Я.Купалы (1997), «Шчаўкунок» А.Палешчанковай (1998), «Пігмаліён» Б.Шоу (2002), «Опера жабракоў» Б.Брэхта (2004), «Васа» М.Горкага (2006), «Мачаха» А.Бальзака (2008). Аўтар серыі графічных лістоў «Настальгія» (1996), «Знакі задыяка» (2008—10) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

**ГУРНА́ЎШЧЫНСКІ СЯДЗІ́БНЫ ДОМ.** Існаваў у 19 — пач. 20 ст. ў в. Гурнаўшчына Клецкага р-на. Аднапавярховы прамавугольны ў плане будынак быў накрыты вальмавым дахам. Гал. фасад вылучаны 4-калонным порцікам з трохвугольным франтонам. Фасады гарызантальна ашаляваны, прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў простых ліштвах. Планіроўка анфіладная. Не захаваўся.

**ГУ́РСКІ** Антон Іванавіч (н. 14.1.1936, в. Лугавая Капыльскага р-на), беларускі фалькларыст. Канд. філал. навук (1978). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1959). Працуе ў Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Даследуе фалькл. жанры, нар. абрады і звычаі, традыц. каляндарную і пазаабрадавую паэзію, любоўную і сямейную лірыку. Аўтар кн.: «Зімовая паэзія беларусаў» (1980), «Тайны народнай песні» (1994), «Святкаванне Калядаў на Беларусі» (1998), «Беларускія загадкі» (2000), «Семантыка і паэтыка сямейнай лірыкі» (2001), «Пазаабрадавая паэзія» (2002), «Малыя жанры. Дзіцячы фальклор» (2004). Вывучае


*А.І.Гурскі.*

жыццёвы і творчы шлях фалькларыстаў Д.Булгакоўскага і П.Дземідовіча («З любоўю да народа», 1989). Складальнік тамоў серыі «Беларуская народная творчасць»: «Загадкі» (1972), «Легенды і паданні» (1983, абедзве з М.Грынблатам), «Зімовыя песні: калядкі і шчадроўкі» (1975), «Земляробчы каляндар» (2003). Дзярж. прэмія Беларусі 1986. *А.М.Ненадавец.*

**ГУ́РСКІ** Ілья Данілавіч (26.4.1899, в. Замосце Уздзенскага р-на — 11.8.1972), беларускі пісьменнік. Засл. дзеяч культуры Беларусі (1969).


*І.Д.Гурскі.*

Скончыў БДУ (1932). У 1924—32 у Галоўрэперткаме, потым у Галоўмастацтве БССР. У 1935—41 рэд. газ. «Літаратура і мастацтва», у гады Вял. Айч. вайны — газ. «За свабодную Беларусь» і сатыр. час. «Партызанская дубінка», у 1944—60 — час. «Беларусь». Аўтар п'ес «Новым шляхам», «Дрыгва» (абедзве 1928), «Сварка» (1929), «Бальшавіцкая вясна» (1930), «Качагары» (1932), «Новы горад», «На крэсах усходніх» (абедзве 1933), «Маці» (1934), «Сваты» (1935), «На варце» (1938), «Патрыёты» (1939), «Хлеб» (1949), «Свае людзі» (1950). Аўтар кніг: апавяданняў «Над Нёманам» (1945), «Зары насустрач» (1949), «Неспакойныя характары» (1955), «У вялікай дарозе» (1958), «Родная дарога» (1961), аповесці «Лясныя салдаты» (1945), рамана «У агні» (1952), рамана-хронікі «Вецер веку» (1966), рамана-памфлета «Чужы хлеб» (1971). На бел. мову пераклаў творы М.Горкага, А.Чэхава, М.Твэна і інш.

*Тв.:* Выбр. творы. Мінск, 1951; На берагах Нявы: апавяданні. Мінск, 1977; Расцвілі вішні: апавяданні. Мінск, 1989.

**ГУРТ,** народная назва групы жанчын — выканаўцаў фалькл. песень (5—7 чал.), запазычаная ў навук. тэрміналогію. У побыце дакладна ўсведамляецца роля кожнага ўдзельніка Г., які самастойна знаходзіць сваё месца ў творчым працэсе, з'яўляецца раўнапраўным сярод іншых. Індывід. вак. майстэрства спевака вызначае яго выканаўчую функцыю: запявала, «пачынальнік» — той, хто «заводзіць» песню; «бас», «тоўсты голас» — выканаўца асн. ніжняга голасу (іх некалькі); «падводка», «гравік» — вядучы верхняга сольнага голасу. Вельмі важна, каб верхні падгалосак быў моцным, а яго ўладальнік валодаў майстэрствам імправізацыі. Пры спевах падводка быццам лунае на фоне ніжніх галасоў. У творчай рабоце прафес. і аматарскія калектывы рэдка звяртаюцца да манеры гуртавых спеваў. Яна больш захавалася ў выкананні носьбітаў традыцыі — фалькл. Г., якія існуюць на тэр. нашай краіны паўсюдна, але найб. распаўсюджаны на Пд і ПдУ. *А.М.Аляхновіч.*

**ГУРТАВЫ́Я ТА́НЦЫ,** найбольш пашыраны від бел. нар. харэаграфіі. Прымеркаваны да каляндарных і сямейных абрадаў. Вылучаюць 3 групы Г.т.: парна-гуртавыя, сольна-гурта-

ныя і з рознай колькасцю змешанага ці аднароднага складу выканаўцаў. Звычайна Г.т. ўзнаўляюць у дзеяннях пэўнага персанажа змест абрадавай песні. Абрадавымі персанажамі ў іх з'яўляюцца «каза», «дзед», «баба», «маладзіца», «афіцэр», «мядзведзь», «цыган», «бусел», «конь» і інш. Яны выконваюць рухі, простыя танц. элементы, уласцівыя гэтым вобразам. Г.т. пашыраны ў веснавых абрадах *Гуканне вясны*, *Юр'я*, *Вялікдзень*, *Сёмуха.* У іх сустракаецца крок з прыстаўленнем другой нагі, з прытопам, з перастукваннем, пераменны крок, бег і інш. нескладаныя камбінацыі рухаў. Танц. «лексіка» ў Г.т. папаўняецца ў асн. за кошт імправізацыі салістаў: разнастайнымі рухамі і паставамі рук з элементамі пантамімы, падскокамі, воплескамі, прытопамі, прысядкамі і інш. Муз. суправаджэнне Г.т. сольнае (інструм., песеннае ці «пад язык») або ансамблевае (інструм., інструм.-песеннае). У наш час у творчай дзейнасці многіх фалькл. калектываў, выканаўцамі ў якіх з'яўляюцца непасрэдныя носьбіты традыцый, на сцэне ў час інструм. пройгрышаў паміж куплетамі абрадавых песень узнаўляюцца разнастайныя харэагр. рухі Г.т.

*Літ.*: Чурко Ю.М. Белорусский хореографический фольклор. Минск, 1990; Козенка М.А. Танцавальны фальклор // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Мінск, 2001. А.М.Аляхновіч.

**ГУРТО́К БЕЛАРУ́СКАЙ МО́ЛАДЗІ**, Гурток беларускай моладзі Гомельскага павета. Існаваў у 1921—27 у г. Гомель пры пед. тэхнікуме. Кіраўнікі: І.Бандарэнка, М.Грышчанка, А.Сарокін, Ф.Валынец, Лашкевіч, Пяскоўскі. Прапагандаваў бел. нац. культуру. У 1921 лекцыі па беларусазнаўстве для сяброў гуртка чытаў бел. этнограф, фальклэрыст, археолаг І.А.Сербаў. У 1923 засн. б-ка (кіраўнік Я.Баравіцкі). Пры гуртку да 1924 працавалі бел. хор і тэатр. трупа. Гурток супрацоўнічаў з Бел. секцыяй пры Гомельскім губернскім аддзеле нар. асветы. Пры яе дапамозе атрымліваў газеты і часопісы з БССР. У ліст. 1924 сумесна з секцыяй арганізаваў бел. куток. Гурткоўцы ў крас. 1925 прынялі ўдзел у заснаванні Гомельскага філіяла літ. аб'яднання «Маладняк» і ўвайшлі ў яе склад. Летам 1925 правёў культ. мерапрыемствы ў 32 нас. пунктах 13 валасцей Гомельскай губ. Склад гуртка некалькі разоў абнаўляўся, у маі 1925 налічваў 46 чал. У яго ўваходзілі некаторыя студэнты Гомельскага лясного тэхнікума.

**ГУРТО́К ПО́ЛЬСКА-ЛІТО́ЎСКА-БЕЛАРУ́СКАЙ І МАЛАРУ́СКАЙ МО́ЛАДЗІ**, маладзёжная арганізацыя выхадцаў з Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны. Існаваў у 1889—93 у Пецярбургу. Аб'ядноўваў пераважна студэнтаў тэхнал. ін-та. Са складу гуртка (быў непастаянны, налічваў каля 25 чал.) выбіраліся старшыня і касір. У розны час старшынямі прызначаліся К.Дабкевіч, І.Вілейшыс, М.Дамашэвіч, з крас. 1893 бел. паэт-рэвалюцыянер А.*Гурыновіч.* Меў касу ўзаемадапамогі. Спачатку кірунак дзейнасці гуртка быў асветніцкі: распаўсюджванне сярод рабочых і сялян легальнай л-ры для ўзняцця агульнага ўзроўню адукаванасці. Кнігі выпісвалі з Варшавы і набывалі ў Пецярбургу. Паступова ва ўмовах развіцця рэв. руху гурток эвалюцыяніраваў да паліт. работы. Некаторыя яго чл. сталі прапагандыстамі ў рабочых гуртках, падтрымлівалі кантакты з сацыял-дэмакр. арг-цыямі. Спыніў існаванне пасля арышту актыву (К.Акуліч, І.Непакайчыцкі, А.Гурыновіч і інш.).

**ГУ́РЫН** Міхаіл Фёдаравіч (н. 8.11.1941, в. Радунь Карэліцкага р-на), беларускі археолаг. Д-р гіст. навук (1991). Скончыў БДУ (1971). У 1976—2005 у Ін-це гісторыі НАН Беларусі. Даследуе стараж. металургію і кавальскую апрацоўку жалеза, ліцейную справу ў Беларусі; сувязі бел. насельніцтва з краінамі Зах. Еўропы ў далёкай старажытнасці і ў сярэдневякоўі. Аўтар навук. работ: «Старажытнае жалеза Беларускага Падняпроўя» (1982), «Млын: гістарычна-эканамічны нарыс» (1985), «Кавальскае рамяство Полацкай зямлі IX—XIII стст.» (1987). Адзін з аўтараў «Археалогіі Беларусі» (т. 2, 1999) і «Гісторыі Беларусі» (т. 1, 2000).

**ГУРЫНО́ВІЧ** Адам Гіляры Калікставіч [25.1.1869, б. фальварак Кавалі (Кавалькі), Мядзельскі р-н — 4.2. (паводле інш. звестак, 26 ці 29.1) 1894], беларускі паэт, фалькларыст.



*А.Г.К.Гурыновіч.*

Вучыўся ў Пецярбургскім тэхнал. ін-це (1887—93), удзельнічаў у студэнцкім падп. руху. Быў знаёмы з родапачынальнікам рус. марксізму Г.В.Пляханавым. У паэзіі працягваў справу Ф.Багушэвіча (вершы «Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею», «Што ты спіш, мужычок...» і інш.). Звяртаўся да жанраў балады, байкі, пейзажнай лірыкі. З фальклору запазычваў матывы і сюжэты з антыпанскімі і антыцарскімі настроямі. Актыўна пратэставаў супраць сац. несправядлівасці. Знаходзячыся пад наглядам паліцыі ў бацькоўскім фальварку Крыстынопаль (цяпер у Смаргонскім р-не), запісваў вуснапаэт. творы. Быў знаёмы з Я.Карловічам і атрымліваў ад яго пастаянныя кансультацыі, таму яго зборы вызначаюцца захаваннем дыялектных норм і навук. дакладнасцю. У «Зборніку беларускіх твораў...» (1893) змясціў разнажанравыя песні, прыпеўкі і загадкі. Выразныя фалькл. матывы прасочваюцца ў творах «У лузе, калінушка, ў лузе...». Запісы Г. ўвайшлі ў тамы серыі «Беларуская народная творчасць» «Радзінная паэзія»